■ Умовы для бізнесу

«Колькасць праверак не паляпшае якасці прадукту»

Больш за дзесяцігоддзе таму пад Мінскам было створана прадпрыемства па вырабе апрацоўчых матэрыялаў. Цяпер яно — адзін з лідараў на гэтым рынку ў нашай краіне. Ініцыятарам стварэння вытворчасці стаў Сяргей НАВІЦКІ, цяпер — генеральны дырэктар «Хенкель Баўтэхнік», па сумяшчальніцтве — намеснік старшыні Савета па развіцці прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь. Як ніхто, ён ведае пра тое, як працуецца беларускім бізнесменам з адмоўнага і станоўчага боку. На мінулым тыдні пакет нарматыўна-прававых актаў аб спрашчэнні ўмоў для вядзення бізнесу быў вынесены на грамадскае абмеркаванне. Сярод дакументаў ёсць і той, які рэгулюе кантрольна-наглядную дзейнасць. Ім прадугледжваецца істотнае памяншэнне колькасці праверак. У прыватнасці, планавыя наогул будуць адменены. Усё астатняе застанецца ў выглядзе рэкамендацый. Мы вырашылі запытаць у Сяргея Навіцкага, як гэта мера паўплывае на прадпрымальніцкае асяроддзе і чым раней перашкаджалі пастаянныя наведванні інстанцый.

— Скарачэнне колькасці праверак для бізнесу — наколькі своечасовая мера?

— Яна нават крыху запозненая. Па-першае, вядома, што рашэнні ў дзяржаве прымаюцца ў адпаведнасці з Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2016—2020 гады. Адпаведна быў распрацаваны комплекс мер па яе рэалізацыі, у якім на адным з першых месцаў стаіць разняволенне дзелавой актыўнасці і ўзмацненне падтрымкі прадпрымальніцтва.

Па-другое, трэба цвяроза разумець, у якіх эканамічных умовах цяпер знаходзіцца краіна. Наша эканоміка на фоне падзення коштаў на нафту, іншых знешніх фактараў стагніруе ў апошнія гады. У 2015 годзе падзенне ВУП склала 3,9%, у мінулым годзе — мінус 2,6%. У гэтым годзе ўжо назіраюцца прыкметы ажыўлення, але ўсё адно сітуацыя пакуль не ідэальная. Калі ўлічыць усе гэтыя фактары, то сёння ёсць неабходнасць падтрымкі прадпрымальніцтва, каб людзі самі аб сабе паклапаціліся і заняліся бізнесам. А для гэтага ім не трэба перашкаджаць, а наадварот, варта аказаць пасільнае садзейнічанне. Чалавеку, які сапраўды мае жаданне зладзіць штосьці сваё, не патрэбны спецыяльныя ўмовы, дадатковыя плошчы. Калі ён не парушае заканадаўства, галоўнае — не перашкаджаць праяўляць ініцыятыву.

— Па ўласным вопыце, ці часта вас наведваюць з праверкамі? І што можаце сказаць аб іншых бізнесменах?

— У нас за апошні час была адна пазапланавая праверка. І тое яна датычылася вузка спецыялізаваных рэчаў, якія маюць дачыненне да прамысловай бяспекі. Дзесьці адбыўся такога плану інцыдэнт, і таму вырашылі ўсіх праверыць. Але такая праверка — не ў пакаранне, а ў дапамогу. Часцей за ўсё ад наведванняў кантрольных органаў і празмерных патрабаванняў церпяць гандаль, грамадскае харчаванне і сфера паслуг.

Для гандлю гэта частыя праверкі гандлёвых інспекцый. Вядома, што на працягу іх высвятлялася, што на прылаўках пратэрмінаваныя тавары. Але ці правяраючыя павінны гэта высвятляць? Тыя, хто прадае такія тавары, самі рызыкуюць. Супольнасць спажывальнікаў сама павінна рэгуляваць гэтае пытанне: калі аднойчы набудзеш сапсаваны прадукт, няўжо другі раз пойдзеш у тую ж краму?

У сферы грамадскага харчавання таксама адбываюцца праверкі, але яна больш пакутуе ад шматлікіх патрабаванняў. Напрыклад, самыя лепшыя сусветныя рэстараны, з трыма зоркамі Мішлен, набываюць самыя свежыя прадукты на рынку без накладных і дэкларацый. У выніку атрымліваецца высакаякасны прадукт. У нас жа абавязкова мусіць быць дакумент аб паходжанні прадуктаў. Але ўявім, што я вырашыў вырошчваць бульбу. Зямлю маю, поле засадзіў, выкапаў яе, палажыў у машыну, адвёз на рынак, стаў прадаваць. Пра якія накладныя можа ісці гаворка? На рынку з маёй машыны рэстаран набыў самы свежы прадукт. Што тут незаконнага?

Жыццё паказала, што колькасць праверак не паляпшае якасці канчатковага прадукту і сэрвісу. Калі б так было, мы б паставілі правяраючага над кожным прадпрымальнікам. Але якасць вымяраецца далёка не гэтымі параметрамі...

— А што наконт сферы паслуг?

— Давайце возьмем жыццёвы прыклад. Калі вы робіце манікюр у сяброўкі, прыходзіце да яе дадому, ведайце, што яна з'яўляецца парушальніцай закона. Наступны раз вы можаце прыйсці да яе з міліцыяй і падатковай інспекцыяй.

У красавіку мінулага года выйшаў СТБ1266-2016 «Паслугі бытавыя. Паслугі цырульняў. Агульныя тэхнічныя патрабаванні», а таксама працуюць «Гігіенічныя патрабаванні да ўладкавання, абсталявання і ўтрымання цырульняў», у якіх прапісана, што паслуга манікюру, педыкюру ці стрыжкі можа быць аказана ці стацыянарна ў салоне, ці на выездзе (значыць, спецыяліст прыязджае да вас дадому). А атрымліваецца наадварот, вы едзеце да яе. Тым больш, калі сяброўка не супрацоўнік салона, аказваць паслугу яна не мае права. З-за гэтага, каб працаваць легальна, некаторыя фіктыўна ўладкоўваюцца ў салон прыгажосці, а пасля самі кампенсуюць атрыманую зарплату. А што было б дрэннага, калі б жанчына афармілася як індывідуальны прадпрымальнік і прымала кліентаў дома, выплачвала падаткі? Такім чынам нас як спажыўцоў абмежавалі ў спосабах атрымання паслугі. Дзеля чаго? Гэта не зробіць наша жыццё больш бяспечным і зручным.

— Праблему акрэслілі. Як прапануеце яе вырашаць?

— Для актывізацыі насельніцтва да прадпрымальніцкай дзейнасці патрабуецца, перш за ўсё, скарачэнне адміністрацыйных бар'ераў як падчас стварэння новых прадпрыемстваў, так і падчас іх дзейнасці, а таксама скарачэнне кантрольна-праверачных мерапрыемстваў. Затым — упарадкаванне мер адказнасці і пашырэнне прымянення такой меры, як папярэджанне, асабліва калі ўчынкі суб'екта не выклікалі ўрон для дзяржавы і грамадства. Нашто адразу чалавека караць?

У мяне было некалькі прапаноў, але, у прынцыпе, той пакет дакументаў аб разняволенні прадпрымальніцкай ініцыятывы, які цяпер прадстаўлены на грамадскае абмеркаванне на сайце *www.pravo.by*, улічыў тым ці іншым чынам кожную з іх. Чакаем, што гэтыя змены ў хуткім часе стануць часткай нашай штодзённай рэчаіснасці.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

■ Нагода для роздуму

Прэмія на Дзень Парыжскай камуны

Калі даводзіцца чытаць матэрыялы праверкі аб злоўжываннях асобных кіраўнікоў, міжволі ўспамінаюцца словы старажытнага паэта Феагніда пра тое, што перасыць нараджае нахабнасць, калі чалавеку дрэннаму выпадае на долю шчасце і калі чалавек гэты не валодае цвярозым розумам. Так можна сказаць пра людзей, якія страцілі ўсе маральныя бар'еры, згубілі сумленне і сорам, і толькі бралі і бралі, і ўсё ім было мала.

Спецыялісты Пінскага міжраённага камітэта дзяржаўнага кантролю Брэсцкай вобласці праверылі фінансава-гаспадарчую дзейнасць прадпрыемства «УКС горада Пінска» і, што называецца, за галаву ўзяліся. На шляху да абагачэння тут не зважалі ні на законы, ні на нормы паводзін. Гэта ў Пінску, дзе вельмі цяжка з работай, дзе многія і многія людзі гатовыя працаваць за 200 рублёў у месяц, і градус грамадскай напружанасці даволі высокі, незаконныя выплаты заработнай платы ў калектыве склалі 95 707 рублёў, а асабіста кіраўніку — 33 651.

Сістэма была распрацаваная аля Астап Бэндэр. Грошы рабіліся з паветра. Так, у адпаведнасці з кантрактам, дырэктару штомесяц выплачвалася прэмія за выкананне заданняў па ўводзе жылых дамоў у нарматыўныя тэрміны будаўніцтва ў памеры 40 працэнтаў акладу. Пасля здачы дома ў эксплуатацыю дырэктар зноў атрымліваў прэмію паводле загаду, які сам і аддаваў. У канцы квартала яшчэ раз налічвалася прэмія за ўвод жылля. Такім чынам, за выкананне тэрміну будаўніцтва аднаго і таго ж дома кіраўнік атрымліваў прэмію тройчы. Вось дзе, у тым ліку, хаваецца кошт квадратных метраў для навасёла.

Ды прэмія вытворчая — гэта адно, дырэктар не саромеўся выпісваць сабе і матэрыяльную дапамогу. Яна склала за год 3897 рублёў. А яшчэ бывалі прэміі на святы. Не забываўся пра сябе кіраўнік на Новы год, Дзень абаронцаў Айчыны, а таксама ў дні Незалежнасці і Кастрычніцкай рэвалюцыі. Ну, у Дзень будаўніка — гэта святое. І калі прадпрымальны дырэктар не выпісаў сабе значную суму на Дзень Парыжскай камуны, то толькі таму, што не знаў, калі адзначаецца гэты дзень. Менавіта такое складваецца ўражанне. У дзень Перамогі ён сябе заахвоціць не саромеўся, хоць гэта можна расцаніць як асаблівы цынізм. Ды што там! За ўсе гэтыя дні ён атрымаў 8000 рублёў. Цяпер мала які пінчук атрымлівае столькі зарплаты за год, ды і ў сталіцы далёка не кожны працаўнік.

Ну, апетыт, як вядома, прыходзіць падчас яды. І пінскаму кіраўніку з такімі даходамі ўсё роўна катастрафічна не хапала. На спажывецкія патрэбы «беднаму» дырэктару сваё ж прадпрыемства выдала беспрацэнтную пазыку ў памеры 68 000 рублёў. І ўжо зусім выглядае дробяззю, што за гэту аперацыю само прадпрыемства заплаціла падаходны падатак (8,15 тыс. руб.), а таксама кампенсавала паслугі банка (1,35 тыс. руб.). Неяк няёмка ўжо і гаварыць, што на службовы аўтамабіль дырэктара за раз спісвалі 665 літраў паліва, калі бак можа ўмясціць толькі 70. А ручку, каб падпісваць загады — ну не абы-якой жа гэта рабіць — набылі за 370 рублёў. Сціплы такі Parker, — ну і што, што ніводная настаўніца, хоць сабе з 40-гадовым стажам, пенсію такую не атрымае? Людзям падабаецца жыць прыгожа. І хто ім можа забараніць?

А вось цікава, ці маглі забараніць ці неяк папярэдзіць беззаконне — вышэйстаячая арганізацыя КУП «Брэсцкае абласное УКС» ды іншыя структуры, якія ажыццяўляюць нагляд за будаўнічымі арганізацыямі? Можа, яны пра гэта скажуць на судзе альбо растлумачаць грамадскасці?

Суд жа мусіць быць. Бо, як паведаміў **намеснік начальніка ўпраўлення Камітэта дзяржкантролю Брэсцкай вобласці Аляксандр СКАВЫШ**, пасля праверкі Пінская міжраённая пракуратура завяла крымінальную справу ў дачыненні да былога дырэктара за крадзеж у асабліва буйных памерах шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

ИЗВЕЩЕНИЕ

О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ ИНДИВИДУАЛЬНОГО ЖИЛИЩНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА. ОРГАНИЗАТОР: КАМЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

№ лота	Вид аукциона, целевое назначение	Местоположение земельного участка, площадь, кадастровый номер	Условия и ограничения	Расходы по подготовке и изготовлению документации	Начальная цена, руб.	Сумма задатка, руб.
1	В частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома	д. Бор, У-12 Лепельского района, площадь 0,2496 га, кадастровый номер 222781701601000135	-водоохранная зона озера «Прудок»; -получение победителем в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство	1133,28	1550,00	155,00
2	В частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома	д. Бор, У-13 Лепельского района, площадь 0,2458 га, кадастровый номер 222781701601000136	-водоохранная зона озера «Прудок»; -получение победителем в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство	1133,28	1550,00	155,00
3	В частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома	д. Бор, У-14 Лепельского района, площадь 0,2432 га, кадастровый номер 222781701601000137	-водоохранная зона озера «Прудок»; -получение победителем в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство	1133,28	1550,00	155,00
4	В частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома	д. Бор, У-15 Лепельского района, площадь 0,2484 га, кадастровый номер 222781701601000138	-водоохранная зона озера «Прудок»; -получение победителем в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство	1133,28	1550,00	155,00
5	В частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома	д. Бор, У-16 Лепельского района, площадь 0,2483 га, кадастровый номер 222781701601000139	-водоохранная зона озера «Прудок»; -получение победителем в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство	1133,28	1550,00	155,00

1. **Аукцион состоится 19 мая 2017 года** в 15.00 по адресу: Витебская область, Лепельский район, агрогородок Камень, улица Ленинградская, 25а.
2. Аукцион проводится в соответствии с Положением, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики от 26.03.2008 года №462.
3. Заявления от граждан Республики Беларусь на участие в торгах принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: агрогородок Камень, улица Ленинградская, 25а, Каменский сельский исполнительный комитет. Последний день приема заявлений: 16.05 2017 года до 17.00.
4. К участию допускаются граждане РБ, подавшие заявление установленной формы, внесшие задаток в размере 10% от начальной цены объекта аукциона в кассу Каменского сельисполкома.
5. Для участия в аукционе необходимо предоставить копию документа, содержащего идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; Представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, удостоверяющую личность, а также предъявить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, и копии платежных документов, подтверждающих уплату залога.
6. Аукцион по лоту состоится при наличии не менее двух участников.
7. Оплата в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, расходы на публикацию в средствах массовой информации.
8. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с земельно-кадастровой документацией и земельным участком на местности.
9. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: строительство инженерных коммуникаций будет осуществлено в соответствии с проектно-сметной документацией.
10. Имеется возможность подключения к инженерным коммуникациям (электроснабжение, газоснабжение).

Контактные телефоны: 8 (02132) 6-99-62; 8 (029) 713-99-41